**Касаты, Л.** Вятры дарог / Л. Касаты // Міёрскія навіны. — 2009. — 14 лют. — С. 3.

**ВЯТРЫ ДАРОГ**



Паразмаўляць з Уладзімірам Іосіфавічам Паршутам давялося ў чырвоным кутку свінакомплексу сельгаскааператыва «Павяцце». Тут ён працуе слесарам, забяспечвае надзейную работу механізмаў. У першую чаргу дапамагае службе галоўнага энергетыка, каб усё было ў парадку з электрычнасцю. Пад наглядам асвятленне ва ўсіх жывёлагадоўчых памяшканнях, каларыферы, рухавікі на гноевых транспарцёрах і інш. Гэта сённяшні дзень.

У свій час Уладзімір Паршута, як кажуць, выконваў інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

– У студзені 1985 года разам з іншымі салдатамі быў у гэтай краіне, – расказвае субяседнік. – Трапіў у асобны батальён сувязі, дыслакацыя якога была непадалёку ад горада Кандагар. Даверылі аўтамабіль «Урал». Кругом горы, пустыня. Летам тэмпература ў цяні днём перавышала 60 градусаў. Гарачыня не выносная. Хадзілі паўраздзетыя, бо ад спёкі ніякага паратунку не было. Часам задуваў вецер. Маглі ўзнікнуць нават пясчаныя буры.

Слухаючы аповед былога салдата, успомніліся радкі верша рускамоўнага паэта з Віцебска Мікалая Наменнікава:

*... и тот день,*
*когда тебя отпустит боль,*
*покинув тело,*
*и ветер сдует*
*слез последних соль,*
*как пепел белый,*
*холодной пустотой*
*едва дыша,*
*поставив точку,*
*протянет чистый лист*
*тебе душа,*
*где нет ни строчки...*

Вецер і дарогі – свет рэчаў, якія акружалі маладога байца. Часта даводзілася перавозіць грузы ад граніцы СССР у глыбіню Афганістана. Здаралася ўсялякае.

– Ехалі ад Кушкі, дзе загрузіліся новымі радыёстанцыямі, – расказвае Уладзімір, – Не вытрымаў матор. Было загадана перасесці на ЗІЛ-131. Пад’язджаючы да Кандагара, зразумелі, што калона, якая ішла ўперадзе, трапіла пад абстрэл. Гарэлі многія машыны, у першую чаргу бензавозы. Атрымалася так, што пад’ехалі блізка да месца бою. І ў нас праблема: закіпела вада ў радыятары. Кругом страляніна, а мы вымушаны былі разбірацца з сістэмай ахаладжэння рухавіка. Вельмі непрыемная сітуацыя. Праўда, усё закончылася добра.

23 лютага 1987 года салдат быў дэмабілізаваны, вярнуўся ў родныя мясціны. А гэта вёска Багданова, што непадалёку ад Паташні. Юнак уладкаваўся вадзіцелем у калгас, працаваў на ГАЗ-52.

У 1990 годзе ажаніўся. Цяпер у сям'і трое дзяцей. Дачка Таня вучыцца ў 4 класе, Андрэй – у 8-ым. Старэйшая Надзея займаецца ў Мінску ў авіяцыйным каледжы.

Гады чатыры таму Уладзімір перамяніў работу, пайшоў працаваць на свінакомплекс.

– Пра гэта не шкадую, бо занятак патрэбны і не сумны, – адзначыў ён.

Перамена была звязана і з пагаршэннем здароўя: у 1990-ым былы афганец перанёс складаную аперацыю па выдаленню ныркі. Кожны дзень быць у дарозе стала складана.

Зайшла размова пра вясковае жыццё. Уладзімір перакананы, што яно мае пэўныя перавагі над гарадскім. Чыстае паветра, прастора. Быт паляпшаецца. Новыя дамы, якія цяпер узводзяцца, па камфортнасці не ўступаюць гарадскім кватэрам. Канешне, працаваць трэба шмат. Праца ў радасць, калі на карысць сваёй сям'і.

Жыве Уладзімір у калгасным доме, які цяпер яго ўласнасць. Лічыць, што жыллё добрае. Трымае гаспадарку – карову, бычка, свіней, апрацоўвае гектарны зямельны ўчастак. Паколькі заробак невысокі, то здаюць малако.

У вольную часіну былы салдат любіць пачытаць кнігі, паглядзець па тэлевізары фільм. Не прапусціць той, у якім падзеі разгортваюцца ў Афганістане. Гэтая краіна стала часцінкай біяграфіі Уладзіміра Іосіфавіча Паршуты. Заўсёды будзе памятаць горныя дарогі і цясніны, спякоту і вецер – гарачы, пясчаны, а таму калючы.

***Л. Касаты***